Слова для Жыцця (162)

Аўтар: Рэдакцыя
29.04.2018 00:00



Папа Францішак

Сапраўдны прарок з’яўляецца прапаведнікам не няшчасця, а надзеі. Ён адчыняе брамы, гоіць карані, аднаўляе прыналежнасць да Божага народа, каб той ішоў наперад. Не дакарае, кіруючыся ўладай, наадварот, з’яўляецца чалавекам надзеі. Папракае, калі гэта неабходна, і адчыняе дзверы, гледзячы на перспектыву надзеі. Сапраўдны прарок, калі добра робіць працу, плаціць за гэта сваім жыццём.

Касцёл мае патрэбу ў прароках. Скажу больш: мы ўсе павінны быць прарокамі.

Не крытыканамі – гэта зусім іншае. Гаворка ідзе не пра заўсёды крытычнага суддзю, які нічога не любіць, якому нічога не падабаецца... Такі чалавек – не прарок. Прарок – гэта той, хто моліцца, глядзіць на Бога, глядзіць на свой народ, адчувае боль, калі людзі блукаюць, плача, але таксама ўмее адпаведна выкарыстаць гэта, каб сказаць праўду. […] І Езус, з аднаго боку, кажа рэзкія словы, але, з другога, аплаквае Ерузалем. Гэтым правяраецца сапраўдны прарок: ён мае здольнасць плакаць над сваім народам і казаць цвёрда, калі павінен тое рабіць.

Няхай у Касцёле не будзе недахопу ў праροцкім служэнні для таго, каб пастаянна рухацца наперад!

Фрагменты гамілii, прамоўленай падчас ранішняй св. Імшы ў Ватыкане, 17.04.2018 †

Слова для Жыцця (162)

Аўтар: Рэдакцыя
29.04.2018 00:00

